**Крыуліна С.У.,** *ст. выкладчык*

# СПАЛУЧЭННЕ АГУЛЬНАЕЎРАПЕЙСКІХ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАМПАНЕНТАЎ КУЛЬТУРЫ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ АСОБНЫХ ТЭМ КУРСА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Улічваючы спецыфіку нашай навучальнай установы як установы культуры, а таксама праблемы беларускага адраджэння на сучасным этапе, пры выкладанні курса гісторыі Беларусі значная ўвага надаецца тэмам развіцця культуры ў розныя перыяды гісторыі краіны. Гэта тлумачыцца яшчэ і тым, што культура Беларусі, маючы сваю спецыфіку, з'яўляецца састаўной часткай агульнаеўрапейскай культуры, што гісторыя культуры Беларусі цесна звязана з гісторыяй еўрапейскай цывілізацыі. Такі падыход да вывучэння культуры Беларусі праілюструем на прыкладзе вывучэння тэмы «Архітэктура барока на Беларусі як складаная частка агульнаеўрапейскага мастацтва».

Барока нарадзілася ў Італіі ў 2-й палове XVI ст., а найбольшага росквіту дасягнула ў яе сталіцы Рыме ў пачатку XVII ст. Новы стыль адпавядаў агульнаму працэсу ўскладнення ўяўленняў аб прыродзе і грамадстве, аб асобе чалавека-стваральніка, які паступова вызваляўся ад путаў рэлігійнага светапогляду і падымаўся да вяршынь разумення мастацтва, яго сутнасці і ролі ў развіцці грамадства. У хуткім часе мастацкі стыль барока распаўсюдзіўся па усёй Еўропе і набыў у розных краінах свае нацыянальныя рысы.

Станаўленне барока ў беларускім мастацтве адбывалася ва ўмовах нарастання сацыяльных, палітычных і ідэалагічных супярэчнасцей у Вялікім княстве Літоўскім. Моцная хваля Рэфармацыі, якая выклікала ўздым грамадска-палітычнай і філасофскай думкі, змянілася наступленнем Контррэфармацыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

феадальна-каталіцкай рэакцыі. Стыль барока быў успрыняты беларускай мастацкай культурай і перапрацаваны ў адпаведнасці з будаўнічымі традыцыямі, што прывяло да стварэння беларускага барока, якое захоўвала і развівала традыцыі народнай культуры, удасканальвала нацыянальнае будаўнічае майстэрства.

Развіццё барока ў мастацтве Беларусі прайшло тры ступені: ранняе барока — з канца XVI да другой паловы XVII ст.; сталае барока — з другой паловы XVII ст. да 30-х гадоў XVIII ст.; нарэшце, позняе — з 30-х гадоў па 80-я гады XVIII ст.

Для мастацтва барока на Беларусі характэрна ўзаемадзеянне заходнееўрапейскіх уплываў з візантыйскімі і мясцовымі традыцыямі. Гэта надало яму пэўную самабытнасць.

Першы помнік архітэктуры барока на Беларусі — езуіцкі касцел у Нясвіжы — быў узведзены ў 1584-1593 гг. італьянскім архітэктарам Дж.М.Бернардоні. У якасці прататыпа ён меў галоўны храм езуітаў Іль Джэзу ў Рыме. Аднак усе кампаненты архітэктурнага аблічча былі творча перапрацаваны і арганічна ўвайшлі ў агульны працэс станаўлення самабытнай архітэктурна-мастацкай сістэмы беларускага барока. Нясвіжскі езуіцкі касцел Божага Цела — першая ў беларускім дойлідстве трохнефная крыжова-купальная базіліка з планам у выглядзе лацінскага крыжа і бязвежавым фасадам, насычаным барочнай пластыкай. Аднак пасля пабудовы Нясвіжскага касцёла на Беларусі на працягу больш чвэрці стагоддзя не было ніводнага падобнага храма. Найбольш блізкія па часе пабудовы яшчэ маюць рысы раманскага стылю, готыкі і рэнесансу. Пазычаныя з Італіі архітэктурныя формы барока на Беларусі доўга спалучаліся з элементамі гэтых папярэдніх стыляў.

Так, напрыклад, касцел Тройцы ў Клецку, пабудаваны амаль адначасова з Нясвіжскім касцёлам, захаваў гатычна-рэнесансную трохчасткавую структуру са шматграннай абсідай, асноўным залавым аб'ёмам і масіўнай вежай над бабінцам. На



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мяжы XVI і XVII стст. культавыя пабудовы мелі рознастылёвы характар.

Саперніцтва паміж каталікамі, уніятамі і праваслаўнымі ў галіне культавага будаўніцтва прывяло да выкарыстання найбольш выразных сродкаў барока і сінтэзу іх з мясцовымі будаўнічымі прыёмамі. У выніку на працягу XVII-XVIII стст. сфарміравалася самабытная архітэктурна-мастацкая сістэма беларускага барока. Пачатковы этап яго станаўлення завяршыўся фарміраваннем характэрнага базілікальнага аднаапсіднага храма з двухвежавым галоўным фасадам (касцёлы ў Дзятлаве — 1624, Вішневе — 1637-1641, касцел кляштара брыгітак у Гародні — 1642-1651 і інш.). Вежы згубілі сваё функцыянальнае прызначэнне і сталі важнымі кампазіцыйнымі элементамі.

Самабытнасць беларускага барока абумоўлена сінтэзам найбольш выразных сродкаў агульнаеўрапейскага барока і беларускага народнага дойлідства, у якім глыбока ўсталяваліся традыцыі Візантыі і Полацкага княства. Пры будаўніцтве найбольш значных культавых храмаў розных канфесій выкарыстоўваўся тып трохнефнай крыжова-купальнай базілікі з двухвежавым галоўным фасадам (Успенскі сабор у Жыровіцах, Богаяўленскі сабор у Магілёве, касцёл езуітаў у Гародні). Менавіта папярочны неф, альбо трансепт, як ідэалагічна завостраны элемент архітэхнікі храма ў беларускім дойлідстве меў тэндэнцыю да паступовага знікнення. Тое ж назіраецца і ў культавых пабудовах XVII ст. з аднанефнай структурай. У XVIII ст. трансепт пачаў зноў актыўна выкарыстоўвацца ў фарміраванні аб'ёмна-прасторавых кампазіцый каталіцкіх і уніяцкіх пабудоў (Будслаў — 1767-1783, царква Ража Божай Маці манастыра базіліянак у Гародні — 1720-1751 і інш).

Сталае барока зацвердзіла кампазіцыю двухвежавай базілікі, далейшае развіццё маляўнічасці ў абрысах архітэктурных збудаванняў, павелічэнне колькасці ярусаў вежаў, узбагачэнне пластыкі фасадаў (Мікалаеўская царква ў Магілёве, касцёлы

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

бернардынак і езуітаў у Менску, дамініканцаў у Княжыцах пад Магілёвам). У грамадзянсай архітэктуры развіваліся прынцыпы ансамблевасці архітэктурных комплексаў (у прыватнасці, паступовае раскрыццё гледачу аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі).

У XVIIIст. на Беларусі ішоў працэс завяршэння фарміравання планіровачнай структуры гарадоў і мястэчак. Цэнтры гарадоў забудоўваліся палацавымі рэзідэнцыямі, кляштарамі і касцёламі ў стылe барока. У гэты час выразныя барочныя рысы набылі цэнтр Гародні, Верхні рынак у Менску, Ратушная плошча ў Віцебску, Парадная плошча ў Полацку. На рынкавых гарадскіх плошчах будаваліся ратушы, якія ў XVIIIст. набылі выразныя дынамічныя кампазіцыі (Магілёў, Віцебск).

Ужо з XVIст. вядомы сядзібы, у якіх жылы дом і брама ўтваралі галоўную планіровачную вось ансамбля. Падобны прыём забудовы прывёў да з'яўлення ў XVIIIст. сіметрычных П-падобных кампазіцый, якія складаліся з жылога дома альбо палаца і двух бакавых флігеляў (апошнія часам ператвараліся ў бакавыя крылы будынка). У XVIII ст. мастацкае аздабленне інтэр'ераў палацаў узбагачаецца барочнымі формамі (роспісы, скульптурная пластыка, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва).

Архітэктурна-мастацкая сістэма позняга барока, якое атрымала ў мастацтвазнаўстве ўмоўную назву «віленскае», найбольш яскрава выявілася ў пабудовах уніятаў: Сафійскі сабор у Полацку /1738-1760/, цэрквы базыльянскіх манастыроў у Беразвеччы /1756-1779/, Барунах /1747-1757/, Вольна /1768/, Талачыне /1769-1779/, Крыжаўзвіжанская царква ў Жыровіцах /1769/, Уваскрэсенская царква ў Віцебску /1772/ і інш.

Для каталіцкіх храмаў таго часу характэрны больш грувастыя манументальныя формы, якія склаліся пад уплывам архітэктуры паўночна-італьянскага барока: касцёлы кармелітаў у Мядзеле /1739-1754/, Магілёве /1739-1752/, мальтыйцаў у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сталавічах /1740-1746/, бернардынцаў у Будславе /1767-1783/, езуітаў у Полацку /1745/ і інш.

Дэкаратыўная пластыка пабудоў, у аснову якой была пакладзена ордэрная сістэма, на працягу XVII-XVIII стст. эвалюцыяніравала ад адзінкавых пілястраў і простых карнізаў да разнастайных раскраповак, вязак пілястраў і спараных паўкалонак, хвалепадодных антаблементаў. Для «віленскага» барока характэрны асаблівая пластычнасць аб'ёмаў, маляўнічасць сілуэтаў, ажурныя стромкія шматярусныя вежы, фігурныя атыкавыя франтоны (царква ў Беразвеччы пад Глыбокім, касцёл кармелітаў у Глыбокім, Полацкі Сафійскі сабор).

Мастацкі вобраз культавага ансамбля быў заснаваны на кантрасце строгай архітэктуры манастырскага корпуса і маляўнічага галоўнага фасада храма (езуіцкія калегіумы ў Бярэсці, Менску, Полацку, Гародні, Юравічах, кляштары картэзіянцаў у Бярозе, місіянераў у Лыскава і інш.)

У развіцці аб'ёмна-прасторавых кампазіцый драўляных культавых пабудоў назіраецца паступовае зліццё архітэктурных форм рознага паходжання з прыёмамі народнага дойлідства. Самыя раннія — гэта храмы «клецевага» тыпу, блізкія да сялянскіх жылых і гаспадарчых пабудоў. Звычайна яны складаліся з трох зрубаў, роўных па вышыні і аб'яднаных агульным вальмавым дахам.

Уплыў эстэтыкі барока прывёў да ўзнікнення ў пачатку XVII ст. самабытнага двухзрубнага храма з плоскім фасадам (царква ў в.Латыгаль, 1633 г.). Крыху пазней узводзіліся падобныя пабудовы базылікальнай канцэпцыі, але з трансептам. Пачаткова трансепт быў роўнавысокім галоўным зрубам і ўтвараў у верхнім сячэнні лацінскі крыж. Пазней рамёны трансепта пачалі будаваць больш нізкімі, чым асноўны зруб. Цэрквы мелі ў ніжнім сячэнні форму лацінскага крыжа, а ў верхнім — план традыцыйнай «клецевай» царквы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, нават самы кароткі агляд архітэктуры барока на Беларусі дае падставы сцвярджаць, што яна з'яўляецца самабытнай і каштоўнай часткай сусветнай архітэктурнай спадчыны.

**Кляцкова І.М.**, *выкладчык*

## ВЫКАРЫСТАННЕ РУСКАЙ РЭЛІГІЙНАЙ ФІЛАСОФІІ Ў КУРСЕ КУЛЬТУРАЛОГІІ

Праблема статусу культуралогіі як навучальнай дысцыпліны мае, як нам бачыцца, некалькі аспектаў. Адначасова з вызначэннем прадмета дысцыпліны, выпрацоўкай асноўнага катэгарыяльна-паняційнага апарату, распрацоўкай методыкі выкладання адной з найважнейшых задач з'яўляецца вызначэнне мэт гэтага навучальнага курса. Тут, напэўна, трэба гаварыць аб некалькіх прыярытэтных мэтах, найважнейшай з якіх, на наш погляд, з'яўляецца ўключэнне студэнтаў у агульнакультурны кантэкст як сусветнай, так і нацыянальнай культуры.

Такім чынам, калі адной з прыярытэтных задач культуралогіі з'яўляецца стварэнне шырокай панарамы культурных форм і з'яў і іх магчымага асэнсавання ў тэарэтычных паняццях, то наступным лагічным крокам уяўляецца вызначэнне шэрага персаналій, уключэнне якіх у культуралагічны дыскурс можа быць прызнана заканамерным і мэтазгодным. На наш погляд, руская рэлігійная філасофія (адна з найбольш яркіх з'яў у сусветнай культуры XIX-XX вякоў) павінна быць прадстаўлена ў межах гэтага навучальнага курса. Дастаткова проста пералічыць праблемы, пастаўленыя і ў той ці іншай меры вырашаныя ёю, каб зразумець неабходнасць адлюстравання іх у змесце курса: лёс